ДУ «МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА
ІМЯ А.С. ПУШКІНА»

# БІБЛІЯТЭЧНЫ ВЕСНІК

**ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЗБОРНІК**

**ВЫПУСК 1**

МІНСК
2018

## Змест

**Жыццё бібліятэк: панарама падзей** ........................................4

Арганізацыйна-метадычныя мерапрыемствы ..........................4

Масавыя мерапрыемствы .......................................................10

**Бібліятэка і час** ......................................................................20

У гонар нобелеўскага лаўрэата. *Круталевіч Т.М.* ..................20

Край як аб’ект краязнаўчай дзейнасці
бібліятэчных устаноў. *Пахолка Н.В.* ......................................23

Через театр кукол – в мир книг. *Ковзелева С.В.* ....................25

Летнія гастролі ля фантана. *Віяленцій В.Я.* ............................29

Чернобыль: не гаснет памяти свеча.
*Тихалова И.Н.* .........................................................................32

# Жыццё бібліятэк: панарама падзей

## Арганізацыйна-метадычныя мерапрыемствы

### ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна”

Нарада “Стан і асноўныя напрамкі развіцця бібліятэчнай справы ў бібліятэках вобласці” (на базе ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна, сакавік, 2018 г.)

Семінар “Бібліятэка і чытач: пошук эфектыўных форм работы” (на базе публічных бібліятэк Лагойскага раёна, красавік, 2018 г.)

Школа метадыста “Асаблівасці выкарыстання маркетынгавых тэхналогій у публічнай бібліятэцы”(на базе публічных бібліятэк Слуцкага раёна, май, 2018 г.)

### ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка”

Метадычны дзень “Аспекты індывідуальнай і масавай работы з непаўналетнімі на розных відах прафілактычнага ўліку” (студзень, 2018 г.)

### ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева”

Семінар “Напрамкі дзейнасці публічных бібліятэк Барысаўскага рэгіёна ў рамках аб’яўленага 2018 года Годам малой радзімы” (красавік, 2018 г.)

Семінар “Дзіцячая бібліятэка: выклікі часу і вобразы прасторы” (красавік, 2018 г.)

Дзесяты Міжнародны выязны семінар “Ключавыя аспекты дзейнасці публічных бібліятэк рэгіёна: стратэгічныя задачы і перспектывы развіцця”ў рамках прафесійна-азнаямляльнага візіту бібліятэкараў Барысаўскага рэгіёна праекта “Навучанне ў шляху”(чэрвень, 2018 г.)

## ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік”

Практыкум “Інавацыйныя формы мерапрыемстваў: арганізацыя і тэхналогія правядзення” (люты, 2018г.)

Дзень спецыяліста “Бібліятэка як новая прастора для творчасці” (красавік, 2018г.)

Метадычная гасцёўня “Бібліятэка для юнага чытача: дыяпазон новых магчымасцяў” (май, 2018г.)

## ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”

Семінар-практыкум “Уліковыя формы работы: правілы афармлення” (люты, 2018 г.)

Семінар “Традыцыі і навацыі ў бібліятэчным абслугоўванні дзяцей і падлеткаў” (красавік, 2018 г.)

Семінар “Край як аб’ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэчных устаноў” (чэрвень, 2018 г.)

## ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

Нарада “Стан і асноўныя напрамкі работы бібліятэк ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” ў 2018 годзе” (студзень, 2018 г.)

Семінар-практыкум “Медыякультура спецыяліста” (люты, 2018 г.)

Семінар-практыкум “Бібліятэка+Чытач: сакрэт эфектыўных узаемаадносін” (чэрвень, 2018 г.)

## ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”

Семінар “Бібліятэка аграгарадка: агульнадаступны культурны, інфармацыйны цэнтр” (на базе Даматканавіцкай сельскай бібліятэкі, сакавік, 2018 г.)

Семінар “Твая бібліятэка – твой стыль: фарміраванне пазітыўнага іміджу бібліятэкі як творчы працэс” (на базе Шчэпіцкай сельскай бібліятэкі, чэрвень, 2018 г.)

## ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйка”

Семінар “Сохраняя традиции, искать новое” (на базе Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Пранузы, чэрвень, 2018 г.)

## ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы”

Нарада-абмеркаванне “Мэтавыя праграмы сельскіх бібліятэк: ад планавання да рэальных спраў” (сакавік, 2018 г.)

Семінар-прэзентацыя “Выставачная дзейнасць бібліятэкі, альбо Новыя грані кніжных выстаў” (май, 2018 г.)

Круглы стол “Бібліятэка для юнага чытача: дыяпазон новых магчымасцяў” (чэрвень, 2018 г.)

## Лагойская цэнтральная раённая бібліятэка

Семінар “Папулярызацыя чытання ў бібліятэках: дыяпазон ідэй, канцэпцый, практыкі” (на базе Лагойскай дзіцячай бібліятэкі, май, 2018 г.)

Нарада “Арыенціры сучаснай публічнай бібліятэкі” (чэрвень, 2018 г.)

## ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”

Круглы стол “Работа з непаўналетнімі, якія знаходзяцца на розных відах уліку” (сакавік, 2018 г.)

Семінар “Краязнаўчая дзейнасць публічных бібліятэк. Арганізацыйна-вытворчы аспект” (красавік, 2018 г.)

## ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”

Семінар і майстар-клас з удзелам галоўнага спецыяліста выдавецтва ТАА “ЛибриФАН” Корбут А.Г. “Сакрэты дзіцячага чытання” (сакавік, 2018 г.)

Савет пры дырэктары “Аналіз атрыманых вынікаў мэтавых праектаў: “Кніга – скарб чалавечай культуры”, “Без прошлого нет будущего”, “Свет под книжной обложкой”, “Дети и чтение – лучшее решение”, “Театр теней”, “Дочитаться до звезды””(чэрвень, 2018 г.)

## ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імяМ. Багдановіча”

Семінар “Бібліяграфічнае краязнаўства – тэрыторыя магчымасцяў, перспектыў” (сакавік, 2018 г.)

Семінар “Культурна-асветніцкая дзейнасць: ідэі, практыкі, праекты” (май, 2018 г.)

## ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”

Семінар “Роля і месца бібліятэкі ў сучасным інфармацыйна-камунікатыўным асяроддзі” (на базе публічных бібліятэк Свірскага і Нарачанскага рэгіёнаў, красавік, 2018 г.)

Семінар-практыкум “Арганізацыя летняга адпачынку дзяцей і падлеткаў у публічнай бібліятэцы” (май, 2018 г.)

## ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”

Семінар “Библиотека – детям: организация досуга детей и подростков” (на базе Салтанаўшчынскай інтэграванай сельскай бібліятэкі, сакавік, 2018 г.)

Семінар “Сохраняя традиции, искать новое: день обмена опытом”(на базе Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

імя П. Пранузы з удзелам супрацоўнікаў Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя А.Астрэйкі, чэрвень, 2018 г.)

## Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка

Нарада “Інавацыі ў рабоце бібліятэк” (красавік, 2018 г.)

## ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”

Семінар “Фарміраванне экалагічнай культуры карыстальнікаў як напрамакдзейнасці сучаснай бібліятэкі” (сакавік, 2018 г.)

Пасяджэнне школы бібліятэчнага майстэрства “Прафесіянал”: “Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэкі: фарміраванне і выкарыстанне” (на базе Падлескай сельскай бібліятэкі-філіяла №35, красавік, 2018 г.)

## Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча

Практыкум “Даведачна-бібліяграфічная і інфармацыйнаядзейнасць сельскай бібліятэкі” (студзень, 2018 г.)

Пасяджэнне бібліятэчнага савета “Даведачна-бібліяграфічная і інфармацыйная дзейнасць Забалоцкай сельскай бібліятэкі” (сакавік, 2018 г.)

## ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”

Метадычныя дні “Контроль стануўліку і справаздачнасці ў бібліятэках ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” (люты/сакавік, 2018 г.)

Вытворчая вучоба “Аб рабоце бібліятэк горада і раёна па падрыхтоўцы святкавання 60-годдзя з дня заснавання г. Салігорска”(люты, 2018 г.)

## ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”

Семінар-практыкум “Бібліятэка – рэсурс патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення” (на базе Падарэскай сельскай бібліятэкі, красавік, 2018 г.)

Семінар-практыкум “Падлетак і бібліятэка: прафілактыка безнагляднасці і правапарушэнняў сярод дзяцей і падлеткаў” (на базе Церабуцкай сельскай бібліятэкі, чэрвень, 2018 г.)

## ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”

Нарада бібліятэчных работнікаў раёна “Падвядзенне вынікаў дзейнасці бібліятэк Стаўбцоўскага раёна за 2017 год” (студзень, 2018 г.)

## ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імяП.Труса”

Семінар-практыкум “Бібліятэчная прастора для дзяцей: сучасны падыход” (на базе раённай дзіцячай бібліятэкі з запрашэннем а. Аляксея, настаяцеля царквы в. Магільна, сакавік, 2018 г.)

Семінар “Бібліятэка – тэрыторыя здаровага ладу жыцця”(на базе Ліцвянскай сельскай інтэграванай бібліятэкі, май, 2018 г.)

## ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”

Семінар “Выхаванне экалагічнай свядомасці ў дзяцей і падлеткаў” (красавік, 2018 г.)

## ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”

Выязное пасяджэнне членаў ББА “Інавацыйныя формы работы”(май, 2018 г.)

Прафесійная гутарка з супрацоўнікамі Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь“Інавацыйныя формы работы” (чэрвень, 2018 г

# Масавыя мерапрыемствы

## ДУ “Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна”

У студзені прайшла святочная акцыя “Пушкінка віншуе Міншчыну!”, прысвечаная 80-годдзю Мінскай вобласці

У лютым у аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача была арганізавана конкурсна-гульнёвая праграма для вучняў 3-4 класаў “Салдат розумам і сілай багаты”, прысвечаная Дню абаронцы Айчыны.

У лютым у аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача ў рамках школы маленькага чытача “Пазнай-ка” прайшла літаратурная гадзіна весялосці “Весёлые друзья” па творах С. Міхалкова.

У лютым у актавай залеадбыўся канцэрт камернай музыкі “Слушаю не музыку, слушаю свою душу…”. Прагучалі творы ў выкананні Наталлі Аруцюнавай і Ганны Мешчараковай.

У сакавіку адбылася сустрэча з Элізабэт Люіс, першым сакратаром Пасольства ЗША па пытаннях інфармацыі, культуры і адукацыі.

У сакавіку ў аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача прайшоў адкрыты прагляд літаратуры для вучняў 6-9 класаў “Трагедыя Хатыні”, прысвечаны 75-годдзю жудаснай падзеі.

У сакавіку ў актавай зале прайшла канцэртная праграма “Высоцкі. Мой фініш – гарызонт ...”з удзелам лаўрэата міжнародных музычныхконкурсаў Аляксея Нежыўца.

У красавіку ў аддзеле абанемента прайшоў адкрыты прагляд літаратуры “Чалавеку шлях адкрыты!”, прысвечаны Сусветнаму дню авіяцыі і касманаўтыкі

У красавіку ў зале перыядычных выданняў адбылася прэзентацыя энцыклапедыі “Рэгіёны Беларусі. Мінская вобласць”, прысвечаная 80-годдзю ўтварэння Мінскай вобласці.

У красавіку ў актавай зале прайшла канцэртная праграма “Мой Гамлет: Шэкспір. Пастэрнак. Высоцкі ...” з удзелам лаўрэата міжнародных конкурсаў Аляксея Нежыўца.

“У маі ў рамках клуба “Рэзананс” адбылася творчая сустрэча, прысвечаная Дню Перамогі.

У маі ў аддзеле абслугоўвання дзіцячага чытача прайшла літаратурная вандроўка “Капітан нашых першыхпадарожжаў”, прысвечаная 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Маўра.

У чэрвені у аддзеле замежнай літаратуры адбыўся вечар настольных гульняў.

У чэрвені ў фае бібліятэкіпрайшла штогадовая святочная мазаіка “Пушкінскі дзень”, прысвечаная 219-годдзю з дня нараджэння А. С. Пушкіна.

У чэрвені ў аддзеле замежнай літаратуры сумесна з Амбасадай ЗША ў Мінску быў праведзены семінар для выкладчыкаў англійскай мовы “Workshop for Teachers”.

## ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка”

У лютымна базе Бярэзінскай раённай бібліятэкі адбылася вечарына паэтычнага настрою “Імкнецца слова да нябёсаў” з удзелам маладой паэткі Касі Глухоўскай. Мерапрыемства было прысвечана Дню роднай мовы.

У сакавіку ў рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі Бярэзінская дзіцячая бібліятэка сумесна з Бярэзінскім РЦК і школай мастацтва правяла раённае свята “Кніга – мой спадарожнік, мой сябар”.

## ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева”

У сакавіку сумесна са сталічным выдавецтвам “Чатыры чвэрці” на базе Лошніцкага цэнтра культуры і вольнага часу адбылася прэзентацыя кнігі “Лошніца” выдавецкай серыі “Малая Радзіма: Барысаўскі раён”. Мерапыемства было

прысвечана Году малой радзімы і дням праваслаўнай кнігі на Барысаўшчыне.

У маі ў Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І. Х. Каладзеева адбылася навукова-практычная канферэнцыя “VII Тышкевіцкія чытанні: гісторыка-культурная спадчына Барысаўскага павета” паводле працы Я. Тышкевіча “Апісанне Барысаўскага павета”. Мерапрыемства было праведзена сумесна з Барысаўскім раённым выканаўчым камітэтам і УА“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” і прысвечалася Году малой радзімы.

У маі ў карціннай галерэі Валерыя Шкарубы ў Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Х.Каладзеева адбылася творчая сустрэча з рэжысёрам-аніматарам, мастаком нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”, ураджэнцам г. Барысава Раманам Бурмаковым.

## ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік”

У маі ў Шылавіцкай сельскай бібліятэцы сумесна з работнікамі Шылавіцкага СДК і ДУ “ВТЦСАН”была наладжана забаўляльная праграма “Нам разам весела”, прысвечаная Міжнароднаму дню сям'і.

У чэрвені Ерхаўская сельскай бібліятэка сумесна з Ерхаўскім СДК правяла тэатралізаванае прадстаўленне “Мір усім дзецям на планеце!”, прысвечанае Міжнароднаму дню абароны дзяцей.

## ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”

У сакавіку Валожынская цэнтральная бібліятэка сумесна з народным літаратурна-мастацкім аб’яднаннем “Рунь” Валожынскага РЦК арганізавала сустрэчу-ўспамін “На крылах паэзіі”, якая прысвечалася паэтам-землякам – Антону Анатольевічу Гедроіцю, Івану Міхайлавічу Асіпацкаму і Мікалаю Андрэевічу Палякову.

У сакавіку ў Ракаўскай сельскай бібліятэцыадбылася творчая сустрэча з мастаком, заснавальнікам арт-галерэі “Янушкевічы” Феліксам Янушкевічам “У славуты Ракаў закаханы…”

## ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

У красавіку аддзелабслугоўвання дзіцячага чытача ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” сумесна з гарадской грамадскай арганізацыяй “Дети не для насилия” правялі ў рамках праекта “Помогая другим, помогаем себе” фотаконкурс “Дружим с книгой всей семьёй”. Па выніках конкурсу быў выпушчаны фотаальбом.

У маі ў ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” адбылося межрэгіянальнае мерапрыемства“Збяры ў сваім сэрцы Беларусь”, прысвечанае Міжнароднаму дню культурнай разнастайнасці і Году малой радзімы.

## ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”

У красавіку ў цэнтральнай раённай бібліятэцы сумесна з літаратурным аб’яднаннем “Голас” і дзіцячай школаймастацтваў наладзілі літаратурна-музычную імпрэзу з удзелам членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрыя Пятровіча і Васіля Найдзіна“Я да цябе прапісан, мой край…”

У чэрвеніцэнтральная раённая бібліятэка сумесна з РЦК правяла свята вуліцы Пралетарская “Аб роднай вуліцы і яе людзях”, прысвечанае Году малой радзімы.

## ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імяА. Астрэйкі”

У маіў Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя А. Астрэйкісумесна з аддзелам адукацыі Капыльскага

райвыканкама да Дня сям’і арганізавалі выставу творчых прац дзяцей з апякунскіх сем’яў і дзіцячых дамоў сямейнага тыпу “Сям’я. Таленавітыя разам”.

У маі Песачанская сельская бібліятэка сумесна з Інспекцыяй па справах непаўналетніх правяла Дзень падлетка “Да чаго прыводзяць шкодныя звычкі”.

## ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы”

У красавіку ў Крупскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Купалы адбылася сустрэча з дзіцячым пісьменнікам Валерыем Квілорыя “Безграничная фантазия Валерия Квилория”, прысвечаная Сусветнаму дню кнігі і аховы аўтарскага права.

У чэрвені ў Крупскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Купалы прайшла прымеркаваная да даты пачатку Вялікай Айчыннай вайны літаратурная гадзіна “Пра дні, якія не забыць”, якая была арганізавана сумесна з БРСМ і Крупскай раённай арганізацыяй Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

## Лагойская цэнтральная раённая бібліятэка

У студзені сетка публічных бібліятэк Лагойскага раёна правяладэкаду краязнаўства “Мая Радзіма – мой непаўторны край”, прысвечаную 80-годдзю Мінскай вобласці.

У лютым бібліятэкарамі Лагойскай цэнтральнай бібліятэкіў СШ №3 г. Лагойска была праведзена прававая інтэлектуальная гульня “Па лабірынтах права” з удзеламначальніка інспекцыі па справах непаўналетніх Лагойскага РАУС Лонскім В.М.

У маі ў Завішынскай сельскай бібліятэцы была арганізавана сустрэча з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны М.Ф.Красоўскай і А.А.Шняк “Война живёт в дыхании моём и горькой тишине воспоминаний”.

## ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”

У лютым Любанская раённая цэнтральная бібліятэка сумесна з аддзелам ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Любанскага райвыканкама, аддзелам адукацыі спорту і турызму арганізавала конкурс-віктарыну “Размаўляем па-беларуску”, прысвечаную Міжнароднаму дню роднай мовы.

У маі Любанская раённая цэнтральная бібліятэка разам з рэдакцыямі часопісаў “Вясёлка”, “Народная асвета”, выдавецтвам “Адукацыя і выхаванне” правяла рэспубліканскую акцыю “Культурны маршрут – Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі – дзецям”.

## ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”

У лютым Ждановіцкая сельская бібліятэка сумесна з БРСМ арганізавала сустрэчу з воінам-інтэрнацыяналістам В.Ф. Быкавым і беларускайпісьменніцай К.С. Хадасевіч-Лісавай “Прикоснись сердцем к подвигу”.

У маі Мінская раённая цэнтральная бібліятэка сумесна з Міханавіцкім ЦК правяла раённы конкурс “Лепшая чытаючая сям’я2018 года”.

У чэрвені ў Каладзішчанскай сельскай бібліятэцы №1 і Старынскай сельскай бібліятэцы-клубе сумесна з культурна-спартыўным цэнтрам і МНС праведзена святочная праграма “Мы шчаслівыя дзеці вялікай краіны”.

## ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”

У красавіку на базе цэнтральнай раённай бібліятэкі і гарадскіх бібліятэк-філіялаў ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча” прайшла акцыя “Маладзечна: з мінулага ў будучае”, прысвечаная 630-годдзю г. Маладзечна.

У красавіку на базе цэнтральнай раённай бібліятэкі прайшла навукова-краязнаўчая канферэнцыя, прысвечанаябеларускаму спеваку, педагогу М.Забэйдзе-Суміцкаму “Міхась Забэйда-Суміцкі і беларуская песня”.

У маі на базе бібліятэкі сямейнага чытання “Верасок” сумесна з аддзелам адукацыі, спорту і турызмуМаладзечанскага райвыканкама быў праведзены злёт юных талентаў Маладзечаншчыны “Пра цябе, мой родны край”, прысвечаны Году малой радзімы.

## ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”

У красавікуцэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка правяла да 75-годдзя з дня нараджэння паэта-земляка Мар’яна Дуксы паэтычную гадзіну “Не згасне ў Бацькаўшчыну вера”, якая прысвячалася Году малой Радзімы.

У маі ў Будслаўскай сельскай бібліятэцы адбылася прэм’ера спектакля аматарскага драматычнага гуртка, які працуе пры бібліятэцы, пастаўленага па матывах п’есы Я.Купалы “Паўлінка”.

## ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузa”

У маі адбыўся ІІІ фестываль паэзіі імя Паўлюка Пранузы “Паэт у адпачынку не бывае…” – “Голасам свайго пакалення”.

У чэрвені ў рамках рэспубліканскай акцыі “Лета з добрай кнігай” прайшла гарадская акцыя ў падтрымку чытання “Лето, книга, я – друзья!” .

## Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка

У лютым на базе Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі адбылося літаратурнае свята “Веліч памятных радкоў да 100-годдзя з дня нараджэння беларускага паэта-земляка

А.Бачылы, арганізаванае сумесна з ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Мар’іна Горка”.

У сакавіку Пухавіцкая раённая дзіцячая бібліятэкаразам з цэнтрам творчасці дзяцей і моладзі “Світанак” правяла ўрачыстае адкрыццё Тыдня дзіцячай кнігі “Імяніны кніжкінага тыдня”, прысвечанае 75-й гадавіне гэтага мерапрыемства.

### ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”

У красавіку ў рамках Года роднай зямлі ў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы сумесна з аддзелам адукацыі, спорту і турызму Слуцкага райвыканкама быў праведзены раённы этап рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка”.

У маі раённая цэнтральная бібліятэка разам з Слуцкай дзіцячай школай мастацтваў наладзіла прэзентацыю кнігі З. Дубовік “Красные маки у чёрных ворот”, прымеркаваную да Сусветнага дня пісьменніка.

### Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча

У студзені на базе цэнтральнай бібліятэкі адбылася рэтраспектыўная кінавечарына “В кадре и за кадром”, актыўны ўдзел у якой прымаў раённы Савета ветэранаў.

### ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”

У лютым у раённай цэнтральнай бібліятэцы ў межах праекта “Культурны код Салігорска” прайшоў гід-трэнінг “Добавь библиотеку в друзья”.

У лютым у раённай цэнтральнай бібліятэцы ў рамках літаратурна-краязнаўчага аб'яднання “Вытокі” адбыўся літаратурна-музычны вечар “Святло роднай мовы”.

У сакавіку ў раённай дзіцячай бібліятэцы прайшла творчая майстэрня з запрашэннем дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва “Праменьчык” “Новая одежда для старой книги”.

## ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”

У красавіку на базе Падарэскай сельскай бібліятэкі сумесна з Падарэскім сельскім Домам культуры была арганізавна патрыятычна-краязнаўчая кампазіцыя “Мой край не абышла вайна”, прысвечаная земляку Аляксею Іванавічу Шубе – арганізатару і кіраўніку Старадарожскай падпольнай арганізацыі, камандзіру партызанскага атрада “Народныя мсціўцы”, камандзіру партызанскай брыгады “Смерць фашызму”.

У маі на базе раённай цэнтральнай бібліятэкі ў рамках мерапрыемстваў даГода малой радзімы адбылася літаратурная сустрэча “Нястомны творца і пясняр роднай старонкі – Кастусь Цвірка”, у якой удзельнічалі вучні і настаўнікі СШ№1 і СШ №2 г. Старыя Дарогі, ЗалужскайСШ, ДУК “Старадарожскі раённы цэнтр культуры і адпачынку”.

## ДУК “Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка”

У сакавіку ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшло свята вясны і прыгажосці “Дзень жанчын”.

У маі ў Старасвержанскай сельскай бібліятэцы да Года малой радзімы прайшоў краязнаўчы марафон “Родны кут – выток натхнення і жыцця аснова”.

У чэрвені ў дзіцячай бібліятэцы адбылася прэзентацыя кнігі М.Маляўкі “Спадчына”з удзелам аўтара.

## ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”

У сакавіку ў рамках “Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі” на базе раённай дзіцячай бібліятэкі прайшоў урок

чытання“Прыгоды ў краіне непрачытаных кніг” з сустрэчай з дзіцячымі пісьменнікамі Я. Явіч, Д. Юртаевым.

У сакавіку да Дня Канстытуцыі РБ адбылося віртуальнае падарожжа па дзіцячым прававым  сайце “Наша Канстытуцыя” з удзелам вядучага спецыяліста Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі РБ Бурай В.І.

**ДУК “Чэрвенская цэнтральная раённая бібліятэка”**

У сакавіку ў цэнтральнай бібліятэцы  ў рамках літаратурна-паэтычнага клуба “Ветразь” адбыўся літаратурна-музычны вечар “Бог і Край бацькоўскі” да 75-годдзя з дня нараджэння паэта-песенніка Уладзіміра Пецюкевіча

У чэрвені ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылася экскурсія-падарожжа “Па месцах мінулых баёў”Чэрвеньшчыны, дзе быў разгорнуты партызанскі рух.

**ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”**

У лютым  у цэнтральнай гарадской бібліятэцы прайшло 1-е першае пасяджэнне клуба “Собеседник”“Пад жалезны звонкальчугі”, на якім адбылася сустрэча з вытворцам сярэднявечных даспехаў А.І. Сіняўскім.

У сакавіку ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы прайшло 2-е пасяджэнне клуба “Собеседник”“Дзівосны бачыцца ўзор” з запрошанайна яго майстрыхай батыку Бараноўскай Зінаідай Мікалаеўнай.

У красавіку ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы прайшло 3-е пасяджэннеклуба “Собеседник”“Зазірні за пласт гісторыі”, на якім аўдыторыя сустрэлася з пісьменнікам М. Галдзянковым.

# Бібліятэка і час

## У гонар нобелеўскага лаўрэата

*(з вопыту папулярызацыі творчасці Святланы Алексіевіч на Бярэзіншчыне)*

Пісьменніца Святлана Алексіевіч –першы беларускі нобелеўскі лаурэат, чалавек, якога сёння ведае ўвесь свет. Яе кнігі выдадзены на 20 мовах свету. Творчасць С. Алексіевіч адзначана 30 літаратурнымі прэміямі, сярод якіх – амерыканскі літаратурны “Оскар”, расійскі “Трыумф”, нямецкія прэміі імя Рэмарка і Міжнародная прэмія міра, французская “Сведка свету”, аўстрыйская прэмія імя Гердэра, і вяршыня – Нобелеўская прэмія “За шматгалосае гучанне прозы і ўвекавечанне пакуты і мужнасці”. Пісьменніцаплённа працуе ў жанры літаратурна-дакументальнай, спавядальнай прозы на працягу 35 гадоў і ўзняла яго да класічных вяршынь. Сваім творчым настаўнікам С. Алексіевіч лічыць Алеся Адамовіча.

Ашаламляльныя творы нобелеўскага лаўрэата – гэта не прыдуманыя гісторыі, а споведзь рэальных людзей, якія расказваюць пра свае перажытыя трагедыі, калі яны трапілі ў экстрэмальныя ўмовы. Праўда жыцця ў кнігах Алексіевіч – аголеная, непрыхарошаная, паказаная буйным планам, гісторыі шчырыя, шчымлівыя, кранальныя – згустак параненай памяці. Яны зліваюцца ў агульнае шматгалоссе: з маленькіх гісторый вырастае Вялікая гісторыя. З такіх выбраных кавалачкаў аголенай памяці складаецца карціна часу, вобраз часу.

30 гадоў таму, 17 чэрвеня 1988 года 40-гадовая пісьменніца наведала Беразіно, адбылася незабыўная сустрэча з мясцовай інтэлігенцыяй, з бярэзінскімі кнігалюбамі. Шырокую папулярнасць на той час ужо набыла першая кніга пісьменніцы з назвай “У вайны – не жаночы твар”, якая пабачыла свет у 1985 годзе да 40-годдзя Вялікай Перамогі. Кніга адразу заявіла аб

сваёй неардынарнасці, трапіла ў фонды бярэзінскіх бібліятэк у спіс краязнаўчай каштоўнасці, бо ў ёй змешчаны ўспаміны пяці нашых зямлячак – удзельніц вайны. На памяць аб сустрэчы на Бярэзіншчыне пісьменніца пакінула аўтограф на кнізе, якая зараз з’яўляецца рарытэтам Бярэзінскай раённай бібліятэкі. Сама сустрэча і неардынарная асоба пісьменніцы яшчэ напрыканцы 80-ых паслужыла штуршком да пільнай увагі бібліятэкараў да творчасці Алексіевіч. У 2004-2005гг., пазначаных святкаваннем60-годдзя вызвалення Беларусі і 60-годдзя Перамогі над фашызмам, упершыню на Бярэзіншчыне пачаў трыумфальнае шэсце тэатр кнігі С. Алексіевіч “У вайны – не жаночы твар”. Шырокай публіцы былі прадстаўлены самыя пранікнёныя старонкі, улічваючы, што яркія эпізоды, узмоцненыя тэатралізацыяй, выклікаюць цікавасць да ўсяго твора, служаць яго найлепшай рэкламай. З аднолькавай цікавасцю тэатр без кулісаў паводле знакавай кнігі Алексіевіч успрымалі ў вучнёўскім класе і ў швейным цэху, на пасяджэннях грамадскіх таварystваў і аматарскіх суполак, літаратурных вечарынах. Да 20-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана дэбютаваў тэатр маналога паводле кнігі Алексіевіч “Цынкавыя хлопчыкі”. У 2011 годзе да 25-годдзя Чарнобыльскай трагедыі каралевай бібліятэчнага тэатра стала “знакавая кніга” С. Алексіевіч “Чарнобыльская малітва”. Калі ў 2013 годзе бярэзінскія бібліятэкары праводзілі шырокамаштабную агіткампанію па прафілактыцы суіцыду, у 16 арганізацыях і ўстановах горада гучалі монатэатралізаваныя маналогі “Недаспяваная песня жыцця” паводле кнігі С. Алексіевіч “Зачараваныя смерцю”. У 2015г., годзе 70-га юбілею Перамогі, жыхары бярэзінскіх аграгарадкоў “на ўра” сустракалі поезд мужнасці з тэатралізаванымі прадстаўленнямі “Ішлі дзяўчаты па вайне”, “Дзеці без дзяцінства” паводле твораў Алексіевіч “У вайны – не жаночы твар”, “Апошнія сведкі”. Не адно дзесяцігоддзе кнігі пісьменніцы, якія ажывіў тэатр Бярэзінскай раённай бібліятэкі, шчыра размаўляюць са слухачамі.

Сёлетні 70-гадовы юбілей слыннай пісьменніцы паслужыў цудоўнай падставай для масавай рэкламы яе твораў пад дэвізам: “5 кніг – 5 шэдэўраў юбіляра”. 23 мая 2018г. тэатр аднаго акцёра прадставіў маналогі герояў кніг юбіляра месяца вучнёўскай моладзі аграгарадка Лешніца.На аўдыторыю літаральна абрынулася бура эмоцый. Такая форма папулярызацыі арыгінальных мастацкіх твораў дазволіла стварыць яркія гукава-візуальныя вобразы, эмацыйна данесці разнастайную гаму думак, пачуццяў, адчуванняў жанчын-франтавічак, дзяцей вайны, матулі воіна-афганца, жонкі ліквідатара аварыі на ЧАЭС ... Месцам выступлення бібліятэчнага выязнога тэатра кнігі ў аграгарадку Любушаны стаў мясцовы сельскі дом культуры. Сімбіёз літаратуры і мастацтва дазволіў любушанскім школьнікам праз прызму сцэнічнага майстэрства убачыць кнігі С. Алексіевіч “У вайны – не жаночы твар”, “Апошнія сведкі”, “Цынкавыя хлопчыкі”, “Зачараваныя смерцю”, “Чарнобыльская малітва”. Уступны імправізаваны маналог пісьменніцы “Я павяду вас дарогай успамінаў” і заключны маналог “Я не спавядальнік, не лекар, не суддзя, я такі ж чалавек, як і вы”, увасобленыя бібліятэчным чытальнікам, дазволілі пераканаўча перадаць жыццёвае і пісьменніцкае крэда Святланы Алексіевіч.

*Круталевіч Т.М.,*
*заг. аддзела маркетынгу*
*ДУК “Бярэзінская цэнтральная*
*раённая бібліятэка”*

## Край як аб'ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэчных устаноў

У апошнія дні чэрвеня прайшоў рэгіянальны семінар бібліятэчных работнікаў ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка" Гродзенскай вобласці і ДУК "Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка патэме краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.Удзельнікі семінара падрыхтавалі даволі насычаную  праграму.

27 чэрвеня бібліятэкары Валожынскага раёна наведалі Ашмяншчыну. Адкрыла семінар Людміла Антонаўна Каханоўская, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ашмянскага райвыканкама, якая расказала аб асноўных прыярытэтах развіцця культуры ў раёне. Дырэктар ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка Марына Рамуальдаўна Белавус пазнаёміла калег з працай сваёй бібліятэчнай сістэмы. Вопытам экалагічнага краязнаўства падзяліліся супрацоўнікі раённай дзіцячай бібліятэкі. У сельскай бібліятэцы аграгарадка Мураваная Ашмянка бібліятэкары Валожыншчыны наведалі музейны краязнаўчы пакой, у сельскай бібліятэцы аграгарадка Гальшаны – музей Дугі Струве. Удзельнікі семінара наведалі помнік прыроды –валун "Нявесцін камень" і руіны Гальшанскага замка. Пасля экскурсіі па Барунскім базыльянскім комплексе бібліятэкары накіраваліся ў сельскую бібліятэку аграгарадка Баруны, дзе была падведзена рыса ашмянскага этапу семінара.

29 чэрвеня гасцей сустракалі бібліятэкары ўстаноў Валожыншчыны. Першым пунктам праграмыбыло наведванне Вішнеўскай сельскай бібліятэкі. Галоўны напрамак дзейнасці ўстановы – краязнаўства, і гэта невыпадкова, бо ў розны час на Вішнеўшчыне нарадзіліся і працавалі Сымон Будны, Уладзіслаў Чарняўскі (музей памяці якога таксама наведаліў рамках праграмы семінара), Канстанцыя Буйло, Уладзіслава Францаўна Луцэвіч (жонка Янкі Купалы), Пятро Бітэль, Хведар Чэрня. Бібліятэкар Алена Генадзьеўна Жвірко пазнаёміла ашмянцаў з гісторыяй Вішнеўскага краю і правяла фотаэкскурсію "Шлях ад віленскай вуліцы ў Вішневе на прэзідэнцкую вуліцу

ў Іерусаліме" у пакоі памяці, прысвечаным Шымону Пэрэсу – 9 прэзідэнту Ізраіля, які нарадзіўся ў Вішневе.

Затым удзельнікі семінара накіраваліся ў гарадскі пасёлак Івянец. Загадчыца бібліятэкі Ірына Бернардаўна Бурачэўская пазнаёміла калег з працай сваёй установы, удзельнікі семінара наведалі касцёл Святога Міхаіла Арханёла, дзе Ігар Аляксандравіч Солтан, бібліятэкар касцёла, правёў экскурсію і пазнаёміў прысутных з гісторыяй касцёла, манастыра манахаў-францысканцаў і ўвогуле гарадскога пасёлка Івянец. Наступнай была Дорская сельская бібліятэка – інфармацыйны і культурны цэнтр аграгарадка, гаспадыня якой Ганна Іванаўна Афоніна ветліва сустрэла гасцей і падзялілася вопытам сваёй работы. Затым бібліятэкары наведалі Валожынскую дзіцячую бібліятэку і Валожынскую цэнтральную раённую бібліятэку – пазнаёміліся з дзейнасцю бібліятэк па выкарыстанні гісторыка-культурнага патэнцыялу раёна ў бібліятэчным краязнаўстве.

Завяршыўся семінар круглым сталом у Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Валожынскага райвыканкама Вікенцій Мікалаевіч Адамовіч расказаў гасцям пра стан і перспектывы развіцця культуры і гісторыка-культурныпатэнцыял Валожынскага раёна. Дырэктар галоўнай бібліятэчнай установы раёна Ірына Міхайлаўна Зянько пазнаёміла прысутных з сучаснымі тэндэнцыямі і перспектывамі развіцця бібліятэк Валожыншчыны.

Пры падвядзенні вынікаў удзельнікі семінара падзяліліся асабістымі ўражаннямі і прапановамі аб далейшай рабоце бібліятэчных устаноў у краязнаўчым напрамку, выказалі меркаванні, што такія сумесныя мерапрыемствы спрыяюць росту прафесійнага майстэрства, павышэнню эфектыўнасці працы з чытачамі.

*Пахолка Н.В.,*
*заг. аддзела бібліятэчнага маркетынгу*
*ДУ "Валожынская цэнтральная*
*раённая бібліятэка"*

## Через театр кукол – в мир книг

Как привлечь детей в библиотеку, пробудить и развить интерес к чтению, превратить встречу с книгой в праздник? Сегодня библиотеки находятся в поиске новых форм и методов работы, позволяющих вызвать интерес к книге, чтению и к самой библиотеке. Развитие интернета и разных образовательных каналов открывает широкие возможности для обретения знаний, общения и творчества, развлечений. Но виртуальное общение не может заменить контакт с живыми людьми. Виртуальный мир – это лишь частичка реального. Интерес к литературе и чтению можно поднять, используя действенные средства. А для этого, конечно же, нужны яркие, зрелищные формы обслуживания, с помощью которых детям можно выразительно, наглядно, доходчиво рассказать о произведении и раскрыть характеры героев. Через всем известный и всеми любимый кукольный театр в мир книги – таков самый короткий и хорошо себя зарекомендовавший путь. А это залог успеха!

Именно театральное представление как форма работы с детьми наиболее востребовано в Заславской городской детской библиотеке. Кукольный театр объединил книгу – куклу – театр. Работа над кукольными спектаклями в библиотеке интересна для детей как младшего, так и среднего возраста. А самое главное, кукольные спектакли помогают полюбить книги и играют большую роль в воспитании культуры чтения. Куклы делают более наглядной такую традиционную форму работы с детьми, как громкое чтение, помогают не только услышать сказку, но и увидеть ее.Необычайность зрелища, которое происходит на глазах детей, захватывает и переносит в совершенно особый, необыкновенный мир, где все возможно.

Организация кукольного театра, самого представления невозможна без предварительной работы.С чего начать? Можно придумать и смастерить оригинальную куклу, которая будет

главным героем в мероприятиях на различные темы и, возможно, станет визитной карточкой. Это может быть какой-то совершенно фантастический персонаж с необычной внешностью и именем. В Заславской городской детской библиотеке такая героиня есть, и зовут её Глаша-рассказчица.

На первых порах в роли артистов, режиссеров, сценаристов, декораторов в библиотеке выступали сами библиотекари. Постепенно в качестве кукловодов и художников декораций, были привлечены активные читатели.

В библиотеке уже накоплен некоторый опыт использования кукольных представлений в продвижении детской книги и чтения. Библиотекари вместе с детьми разыгрывают небольшие спектакли. Участие в постановках позволяет ребятам раскрыть способности, реализовать творческий потенциал, развивает коммуникативные навыки.

Первые постановки кукольного театра, который получил название "Казачная скарбонка", датируются декабрем 2015 года. В связи с небольшой коллекцией кукол, спектакли выходили нерегулярно. Премьеры планировались по мере изготовления персонажей силами самих библиотечных работников.

С 2016 года в репертуаре кукольного театра в основном литературные и экологические спектакли, каждый демонстрируется по 5-6 раз. В копилке театра три постановки. Для будущих спектаклей реставрируются куклы, шьются костюмы, рисуются декорации.

К Новому, 2017-му, году в библиотеке "В мастерской Деда Мороза"приготовили декорации, поставили новой спектакль"Новогодние приключения колобка", который посмотрели почти все воспитанники детских садов города.

Премьера новой кукольной постановки "Сказка о рыбаке и драконе" состоялась 1 июня 2016 года. Спектакль пользовался большим успехом, и его пришлось повторять 11 раз, но даже на этих спектаклях зрительских мест не хватало и приходилось постоянно подставлять стулья. Мастерством артистов-

библиотекарей и их кукол приходили восхищаться целыми семьями и группами детских садов.

В дни осенних каникул в детской библиотеке состоялась премьера кукольного спектакля “Огнехвостик и Огонь”. Посмотреть спектакль и поучаствовать в литературной викторине по пожарной безопасности пришли ребята начальных классов и воспитанники старших групп детских садов города.

В 2018 году юные читатели библиотеки и их родители очутились в доброй новогодней сказке“А снег кружил и падал…” Ребята активно участвовали в викторине, отгадывали загадки, рассказывали стихи.

На открытии Недели детской книги ребята посмотрели премьеру кукольного спектакля “Доброта”, а на закрытии Недели ребят ожидал кукольный спектакль “Как кот воеводою был”.

Понравился юным зрителям спектакль “Маша и медведь” на современный лад. Ребята остались довольны и пообещали обязательно прийти еще раз в библиотеку на очередную сказку.

Репертуар театра пополняется постановками, направленнымина обращение внимания кобеспечению безопасности жизнедеятельности. Спектакль “Злая спичка” учит ребят правильному обращению с огнем.

Кукольные постановки доступны для сознания детей, образы героев любимых сказок, которые оживают на сцене благодаря библиотекарям, приносят радость и восторг. Ребята не расходятся, когда эти встречи подходят к концу, перелистывают страницы книг и журналов, рассматривают яркие картинки. В заключение мероприятия каждый маленький читатель берет с собой домой любимую сказку и прекрасное настроение.

В настоящее время в библиотеке ежеквартально для организованных групп дошкольников и учащихся младших классов проходят спектакли, на которых бывает более 200 детей.

Библиотекари все время в поиске новых и интересных сценариев, постоянно обновляется кукольный “фонд”. И работа

эта ведется успешно – дети всегда рады новым персонажам и новым историям.

С помощью театральных постановок создается связь маленького зрителя с книгой и библиотекой. Не все дети, читая книгу, улавливают авторскую мысль. А спектакль помогаетдонести до сознания ребёнка суть произведения, заложенную
в нём идею.

Конечно, кукольный театр в библиотеке – это очень хлопотно, требует много дополнительной работы, усилий. Но все это окупается горящими глазами детей, которые с радостью бегут в библиотеку и с восторгом наблюдают за действиями спектакля. Это не только забава для веселого досуга, такой театр воспитывает, научает детей азам дружбы, любви, трудолюбия, правдивости. При этом негативные черты людей, такие как лень, зазнайство, злодейство, высмеиваются, прививая отрицательное отношение к этим свойствам характера.

Заниматься в библиотеке работой этого направления нужно, сомнений нет. Опыт работы кукольного театра “Казачная скарбонка” Заславской городской детской библиотеки показал, что дети, сначала пришедшие на кукольные спектакли, затем проявляют интерес к книге и становятся постоянными читателями библиотеки.

*Ковзелева С.В.,*
*библиотекарь I кат.,*
*отдела библиотечного маркетинга*
*ГУ “Минская районная*
*центральная библиотека”*

## Летнія гастролі ля фантана

Яшчэ з зімы, сумуючы па цяплу і прыгожаму фантану ля Палаца культуры, сельскім бібліятэкарам Уздзенскага раёна была прапанавана прыняць удзел у маштабным конкурсе “Летнія гастролі ля фантана”. І вось з пачатку лета, пры падтрымцы супрацоўнікаў раённага Дома культуры, пачаліся бібліятэчныя гастролі.

7 чэрвеня першай ластаўкай конкурсу “прыляцела” спартыўна-гульнёвая праграма “Старыя казкі пра галоўнае”, якую правяла бібліятэкарЗенькавіцкай сельскай бібліятэкі Галіна Астравух.

Моцны вецер шкуматаў парасончык з эмблемай конкурсу, гартаў іперакульваў кнігі на выставах, халодныя пырскі фантана напаміналі пра дождж, які недзе заблудзіўся, хмары навісалі над Палацам і бульварам, аленіякія выкрутасы пагоды не змаглі сапсаваць  летні настрой ні ў дзяцей, ні ў дарослых.

Трывала і ўпэўнена стаяў “Летні гастрольны чамадан”, хаваючы ў сваім нутры цікавінкі і сюрпрызы, не паказвала хвалявання вядучая, пераапранутая ў Кніжную фею, шчыравалі ў ролі конкурсу да пачатку паспелі і кніжкі пагартаць, і да конікаў прымерацца, і з хатлянскімі паясамі пагуляць.

А потым пачалася гульнёвая дзея па казках Шарля Перо. Дзве каманды самых летніх колераў – “Зялёныя” і “Жоўтыя” – змагаліся за галоўныя прызы, збіраючы на кожным конкурсе бібліятэчныя каталожныя карткі.

Конкурсаў было шмат, але асаблівы ўсплеск эмоцый выклікалі спартыўна-літаратурныя эстафеты. На старт выходзілі то “Каты ў ботах” (боты – амаль 50-га памеру!), то “Чырвоныя каптурыкі” з кошыкамі, то “Папялушкі” у капелюшах і з веерамі. Узрост удзельнікаў вагаўся ад пяці да дзесяці гадоў, асаблівую павагу выклікалі самыя маленькія аматаркі казак і конкурсаў – Васіліна і Ангеліна. Яны старанна выконвалі

заданні, паказалі добрыя веды казачных сюжэтаў, ні разу не закапрызілі, калі не маглі перамагчы больш увішных дзяцей. Вялікі дзякуй матулі дзяўчынак – яна дапамагала не толькі дачушкам, але і нам, бібліятэкарам.

Старанні ўдзельнікаў Кніжная фея адзначыла салодкімі прызамі – спонсарам выступіла цэнтральная раённая бібліятэка імяП.Труса. У гэты раз перамаглі “Жоўтыя”, бо ў іх скарбонцы назбіралася аж38 каталожных картак!

Другі тур гастроляў ля фантана праводзілі культработнікі і бібліятэкары Азерскай і Цепленскай сельскіх бібліятэк. Да наведвальнікаў гарадскіх аздараўленчых пляцовак завітала Бабуля Гульня з унучкай Надзейкай. Зноў лунаў над плошчай парасон з лагатыпам “Летнія гастролі ля фантана”, гучала бадзёрая музыка, ля кніжнай выставы “Лета – лепшых кніг пара” збіраліся адданыя чытачы (і тыя, хто імі стане ў будучым). А потым паважна выплыў за Бабуляй гастрольны чамадан і … закруцілася-завярцелася гульнёвая дзея “Лета – вясёлая пара”. Амаль гадзіну плошча перад Палацам культуры звінела галасамі і смехам дзяцей. Акрамя задавальнення ад гульняў і конкурсаў каманды атрымалі салодкія прызы.

Праграма літаратурна-мастацкага пленэра “Беларусь мая сінявокая”, якую падрыхтавала бібліятэкар Ліцвянскай сельскай бібліятэкі Наталля Сяліцкая, уключала як інтэлектуальныя конкурсы, так і спаборніцтвы на рухомую актыўнасць, кемлівасць, меткасць.

У краязнаўчай вандроўцы затрымліваліся нашы асноўныя ўдзельнікі –выхаванцы аздараўленчай пляцоўкі. Веласіпедысты пад кіраўніцтвам ПятраВіктаравіча Атрушкевіча дэманстравалі “змейку”, меткія стралкі кучкаваліся на пляцоўках з гульнямі “дартс” і “серсо”, шчырым беларусікам прыйшліся даспадобы гульні з паясамі і пераапрананнямі, маляванне на асфальце, конкурс “Беларускае слоўца”, інтэлектуалы не адыходзілі ад шахматных дошак. Каля стэндаў з малюнкамі юнай мастачкі Эльвіры Лягінай працягла затрымаліся госці з аграгарадка Дзешчанка: разглядалі нацюрморты, адгадвалі, да якіх баек Эля

намалявала ілюстрацыі, адказвалі на пытанні літаратурнай віктарыны.

А потым журы, у якое ўвайшлі калегі Наталлі Анатольеўны і памочнікі валанцёры, падвяло вынікі і ўручыла пераможцам медалі і салодкія падарункі.

Выснова, якую мы зрабілі па выніках бібліятэчных гастроляў у чэрвені, такая: чым больш пляцовак і актыўных формаў задзейнічана, тым ярчэй агульная дзея і цікавей дзецям.

Да наступных сустрэч ля фантана ў ліпені і жніўні!

Вынікі конкурсу будуць падведзены на святочным мерапрыемстве, прысвечаным Дню бібліятэк Беларусі ў верасні.

*Віяленцій В. Я.,*
*бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу ГУК "Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса".*

## Чернобыль: не гаснет памяти свеча…

В октябре 2017 года Крупская районная библиотека переехала в новое помещение. Светло, уютно, просторно и удобно – для читателей и для библиотекарей. Сегодня мы можем радовать наших пользователей новинками любимой литературы, тематическими выставками и теплотой творческих встреч. Но любая работа лучше ладится тогда, когда выполняешь ее не в одиночку. Этой точки зрения придерживается и наша библиотека, которая работает в тесной связке со школой, учреждениями культуры, духовенством. Практически ни одно мероприятие в библиотеке не осуществляется силами только самих сотрудников, всегда рядомнадежные партнеры и помощники. Особенно частые гости в библиотеке члены районного Совета ветеранов. Это люди, которые любят книгу, которых волнует судьба библиотек, кто искренне очет помочь библиотеке в ее повседневных делах и развитии. Такое сотрудничество помогает улучшить обслуживание читателей, сделать ярче и качественнее библиотечные мероприятия.

32 года назад весь мир потрясла произошедшая техногенная катастрофа – Чернобыльская трагедия. Заместитель председателя районного Совета ветеранов Иотченко Елена Евтихьевна обратилась к коллективу библиотеки с просьбой организовать 26 апреля, в Международный день памяти жертв радиационных аварий и катастроф, встречу людей, которые покинули родные, зараженные в результате аварии на АЭС территории. Это была нелегкая задача, поскольку переселенцы неохотно ходят на такие мероприятия, многие и сегодня без слёз не могут вспоминать, как проходило отселение, а слово “Чернобыль” для всех стало синонимом слова “беда”. Но Елена Евтихьевна, сама уроженка Брагинского района, занимающаяся проблемами переселенцев и поддерживающая с ними связь, сумела найти нужные слова.

Врайонной библиотеке с воодушевлением подхватили инициативу, ивечер-реквием “Не гаснет памяти свеча” состоялся.На мероприятие пригласили ликвидаторов и потерпевших от последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС, проживающих в городе Крупки, и учеников старших классов школ города.

Вовступительномслове библиотекарь говорила о том, что авария на Чернобыльской АЭС отнесена к одной из самых страшных экологических катастроф, о масштабах трагедии, её последствияхи мерах борьбы с радиационным загрязнением, о заболеваниях, вызванных радиацией. Были названы имена пожарных, которые вели борьбу со стихией, рискуя своей жизнью, защищающих всех нас.

Электронная презентация “Чернобыль: память не меркнет” продемонстрировала картины техногенной аварии 1986 года, фотографии первых ликвидаторов, наглядно высветила возникшие после аварии на ЧАЭС проблемы. В читальном зале была оформлена книжная выставка “Чернобыль в памяти и книгах”, где была представлена документальная и художественная литература, раскрывающая тему Чернобыльской трагедии.

Трудно представить себе горе тех, кто навсегда прощался с малой родиной: с домом, где родился и вырос, с родной околицей, с землей, где покоятся предки, – со всем тем, с чембыла связана вся их жизнь. Крупская поэтесса Татьяна Коваленко очень трогательно говорила о людях, которые не по своей воле оказались вдалеке от тех мест, где прошло их детство и юность, начиналась трудовая деятельность, прочитала свои стихи.

Продолжила эту теплую встречу Елена Евтихьевна. Она назвала имена тех, кто пришёл на наше мероприятие: Ерошенко Софья Васильевна, Мартыненко Ольга Ивановна, Королёв Виктор Харитонович, Минич Валентина Ивановна, Мартыненко Ольга Ивановна, Ерошенко Наталья Николаевна, Ковальчук Мария Михайловна, Лисовская Екатерина Николаевна,

Новицкая Мария Ефимовна, Шаповалов Борис Макарович. Все они вспоминали родные места, рассказывали о том, как военные проводили дезактивацию: меняли крыши домов, мыли помещения, проверяли продукты питания.

Особый интерес у присутствовавших вызвал рассказ ведущей об иконе "Чернобыльский Спас", которая была написана в память о погибших от радиоактивного заражения и во здравие выживших. Уникальность иконы в том, что впервые в православной иконописи рядом с ликами святых изображены люди. Икону передали Успенскому Храму, но по просьбе чернобыльцев она постоянно находится в крестных ходах по областям Украины.

Болит, не заживает чернобыльская рана. И не найти слов, которые бы утолили зту боль…

Под музыку "Аве Мария"зажгли свечу, и все присутствующие почтили память жертв Чернобыля минутой молчания.

Мероприятие закончились, но гости не спешили расходиться. За чаепитием они рассказывали о себе, о своих родных, о том, что им пришлось пережить,сколько поменять мест, прежде чем поселились на Крупской земле, которая стала для них родной.

*Тихалова И.Н.,*
*библиотекарь 2 кат.*
*отдела библиотечного маркетинга*
*ГУК "Крупская центральная районная библиотека им. Я. Купалы"*

**Бібліятэчны веснік: інфармацыйны зборнік**

**Вып. 1**

Складальнік: Мельнічак А.А.

Рэдактар: Законнікава Л.Г.

Падпісана да друку 03.08.2018 г.

Тыраж 3 экз. Заказ № 6

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
ДУ "Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна"